Источник: "Звязда" - 2024-06-22

# ЗУБРОЎ ПАБОЛЬШАЛА, АЛЕ ЗНІКЛІ ХАМЯКІ...

**У навуковай супольнасці і сярод аматараў прыроды працягваецца актыўнае абмеркаванне праекта новай рэдакцыі Чырвонай кнігі Беларусі, якая павінна будзе выйсці ў наступным годзе. Па папярэдніх даных плануецца, што ў яе будзе ўключана 308 відаў раслін і 211 прадстаўнікоў айчыннай фаўны.**



У параўнанні з дзейным сёння 4-м выданнем Чырвонай кнігі, якое змяшчае 203 віды жывёл і 303 — дзікарослых раслін, колькасць аб'ектаў аховы ўзрасце. Як расказаў дырэктар Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Дзмітрый Грумо, у фларыстычны пералік мяркуецца ўключыць 187 відаў сасудзістых раслін, 35 — мохападобных, 22 — водарасцi, 29 — лішайнікі і 35 відаў грыбоў. Пры гэтым 26 відаў, якія сёння знаходзяцца пад асаблівай аховай (9 відаў сасудзістых раслін, 1 — мохападобны, 1 — лішайнік, 9 — грыбоў і 6 відаў водарасцяў), будуць выключаны, а 28 новых уведзены ў спіс.

Працягваецца работа па праверцы і абследаванні месцаў вырастання асобных рэдкіх відаў, робяцца абагульненні, пішуцца суправаджальныя нарысы. Да снежня спіс новай Чырвонай кнігі павінен быць цалкам падрыхтаваны. Аднак у навуковай установе звярнулі ўвагу на тое, што фактычна маніторынг за раслінным светам ажыццяўляецца штогод. І калі для выдання Чырвонай кнігі ўстаноўлена перыядычнасць не радзей як адзін раз на дзесяць гадоў, то гэта не азначае, што з яе выпускам спыняцца назіранні. Пры неабходнасці змены могуць уносіцца і ў дзейную рэдакцыю.

У том «Жывёлы», паводле слоў генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра Чайкоўскага, уключана быццам і няшмат відаў — усяго 1,2 працэнта ад фаўністычнага складу, аднак для захавання біяразнастайнасці важны кожны від. Няма бескарысных жывёл. У кожнага ў гэтым свеце ёсць свая роля, сваё месца. Таму так важна зберагчы відавую разнастайнасць. З 5-га выдання Чырвонай кнігі прапаноўваецца выключыць 13 відаў, 11 з якіх насякомыя, але дадаць 21 новы від. Найбольшыя змены ў спісе сярод беспазваночных. А ў частцы чырванакніжных пазваночных жывёл мяркуецца змяніць клас аховы.

У выніку значнага росту колькасці зубра — у 9 разоў (!) — катэгорыю аховы для яго мяркуецца панізіць з III на IV. Паляпшэнні будуць зафіксаваны для мядзведзя, рысі, барсука, гарнастая. Сярод птушак навукоўцы фіксуюць станоўчую дынаміку ў папуляцыях арлана-белахвоста, дамавога сыча, залацістай шчуркі, драча. Хутчэй за ўсё, ручаёвую фарэль перавядуць з II у III катэгорыю.

Але ёсць і такія віды, стан якіх выклікае ўсё большую асцярогу. Шмат гадоў ужо няма афіцыйнага пацвярджэння рэгістрацыі пасялення звычайнага хамяка. Статус аховы для яго мяркуецца павысіць з III адразу на I. Нягледзячы на спробы аднавіць колькасць заходняга падвіду глушца: ахова такавішчаў, развядзенне ў гадавальніку, скарачэнне паляванняў, папуляцыя памяншаецца. Па назіраннях спецыялістаў, за апошнія дваццаць гадоў колькасць гэтых птушак знізілася практычна ўдвая. Навукоўцы прапануюць уключыць заходні падвід глушца ў Чырвоную кнігу Беларусі і ўстанавіць для яго II катэгорыю аховы. З-за актыўнасці інвазійнага ратана-галавешкі катэгорыю абарыгеннага віду — гальяна азёрнага вымушана павысяць з III да I.

А ў Мінпрыроды нагадалі, што ў мэтах захавання рэдкіх і тых, якія знікаюць, відаў раслін і жывёл пастаянна вядзецца работа па перадачы пад ахову і ўліку месцаў пражывання і вырастання чырванакніжных аб'ектаў. З 2021 года выяўлена і аформлена 1237 такіх месцаў. З іх у Брэсцкай вобласці — 85, Віцебскай — 160, Гомельскай — 157, Гродзенскай — 297, Мінскай — 449, Магілёўскай — 89. Таксама ўзяты пад ахову больш як 34 тысячы гектараў тыповых і рэдкіх прыродных ландшафтаў. У цэлым 56 % тэрыторыі краіны заняты прыроднымі экасістэмамі. Каля 41 % складаюць лясы, і за апошнія 30 гадоў лесапакрытыя плошчы павялічыліся на 14 %. Таму Беларусь па праве лічыцца ляснoй краінай, дзе клапоцяцца аб захаванні прыродных багаццяў.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ,**
**фота аўтара.**